# Аляксандр Лукашэнка залажыў падмурак адной з чытальных залаў Нацыянальнай бібліятэкі

**Сёлетні рэспубліканскі суботнік традыцыйна прайшоў пад эгідай дапамогі ва ўзвядзенні аднаго з найбольш значных аб'ектаў нашай радзімы. На гэты раз ім стала Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Разам з больш як трыма мільёнамі суайчыннікаў удзел у гэтым высакародным дабрачынным мерапрыемстве ўзяў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.**

Як вядома, менавіта прэзідэнт прыняў прынцыповае рашэнне аб узвядзенні новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі падчас наведвання ў пачатку лістапада 2001 года старога будынка «Ленінкі». 7 сакавіка 2002 года пабачыў свет указ кіраўніка Беларусі, згодна з якім будаўніцтва галоўнай бібліятэкі краіны аб'яўлена важнейшай агульнадзяржаўнай і агульнанароднай будоўляй. 11 верасня 2002 года Аляксандр Лукашэнка пералічэннем свайго месячнага заробку ў фонд новабудоўлі пацвердзіў сваю адданасць ідэі ўзвядзення новага Храма ведаў не толькі як прэзідэнт, але і як грамадзянін.

Таму абсалютна натуральным было з'яўленне беларускага лідара раніцай 19 красавіка менавіта ў сталічным мікраараёне Усход, дзе поўным ходам ідзе гэта будоўля.

З першага лістапада мінулага года будаўнічыя работы вядуцца кругласутачна, асвоена больш за 13 мільярдаў рублёў, усе тэрміны вытрымліваюцца. Пра гэта расказаў кіраўніку дзяржавы прэзідэнт канцэрна «Мінскбуд» Валерый Чычурын. Паводле яго слоў, Нацыянальная бібліятэка, як і планавалася, будзе пабудавана да верасня 2005 года.

Асаблівую ўвагу прэзідэнт звярнуў на аптымальнае выкарыстанне ўзведзеных плошчаў бібліятэкі. Як у такой справе і трэба, будынак для Нацыянальнай рыхтуецца «на выраст». Разлікі спецыялістаў сведчаць, што нават пасля размяшчэння ўсіх фондаў бібліятэкі ў будынку застанецца вольнае месца. Аляксандр Лукашэнка даручыў прадумаць магчымасць арганізацыі ў Нацыянальнай бібліятэцы некалькіх спадарожных накірункаў. Так, кіраўнік краіны прапанаваў ідэю перамяшчэння сюды дзяржаўных архіваў.

Пасля непрацяглага інструктажу па тэхніцы бяспекі Аляксандр Лукашэнка накіраваўся ў самае сэрца будоўлі — на ўзвядзенне падмурка адной з чытальных залаў. Ні сам беларускі лідар, які амаль чатыры гадзіны на роўных з прафесійнымі будаўнікамі выконваў бетонныя работы, ні яго акружэнне цяжкай працы не цураліся. Будаўнічую пляцоўку пакінулі толькі пасля выканання ўсяго запланаванага аб'ёму работ.

**Сяргей ПРОТАС.**



Фота Генадзя СЯМЕНАВА.